# Квест «Залацінкі роднай мовы»

**В. А. Жук,**
настаўнік беларускай мовы і літаратуры вышэйшай катэгорыі
Ждановіцкай СШ Мінскага раёна

Час, адведзены на выкананне квесту: 40 хвілін.
**Удзельнікі квесту:** вучні 1– 6 класаў.
**Месца правядзення:** кабінеты № 15, 16, кабінет рытмікі.
**Абсталяванне:** маршрутныя лісты для каманд, лісты і ручкі для запісаў.
**Мэты:**

- стварыць умовы для знаёмства ўдзельнікаў квесту з новымі беларускімі словамі;
- садзейнічаць развіццю станоўчай матывацыі да вывучэння беларускай народнай спадчыны і культуры;
- спрыяць выхаванню павагі да беларускага слова, мовы і культуры

**Ход квесту**

**I. Уводзіны. Арганізацыйны момант**

**Настаўнік.** Добры дзень! Вітаем вас! Прывітанне! Шанаванне! З добрым ранкам! Добры вечар! Рады вас бачыць! Так беларусы звяртаюцца адзін да аднаго пры сустрэчы. Багатая наша беларуская мова. Багатую спадчыну мы маем, бо нашы продкі пакінулі нам самабытную культуру, традыцыі, звычаі. Сёння мы запрашаем вас прыняць удзел у квесце «Залацінкі роднай мовы», каб паказаць свае веды, а таксама вывучыць новыя беларускія словы.

**II. Паведамленне мэты квесту**

**III. Знаёмства з правіламі квесту**

*Тры станцыі. Адказаць на пытанні, выканаць заданні. Атрымаць балы.*

**IV. Правядзенне Квесту «Залацінкі роднай мовы»**

1. Выбар назвы каманды (па-беларуску, сімвалізуе нешта беларускае).
2. Конкурсы «Апрані ляльку. Накармі ляльку».
   Першы этап: выбраць з прапанаваных словы, якія абазначаюць адзенне, і прымацаваць на ляльку (рукавіцы – на рукі, шкарпэткі – на ногі, брыль – да галавы і інш.)
   Другі этап: выбраць з прапанаваных словы, якія абазначаюць стравы, і словы, якія абазначаюць неядомыя прадметы.

3. Гульня «Збяры валізку».

Каб адправіцца ў падарожжа, неабходна сабраць валізку (чамадан). Удзельнікі гульні выбіраюць назвы рэчаў, якія спатрэбяцца ім падчас падарожжа.

4. Конкурс «Смачныя словы. Прыгожыя словы».
   Удзельнікам гульні прапануюцца выявы ягад («Смачныя словы») і выявы кветак («Прыгожыя словы»). Да кожнай выявы ўдзельнікі падбіраюць беларускія назвы.

**V. Падлік балаў**

**VI. Падвядзенне вынікаў. Узнагароджанне пераможцаў**

**VII. Рэфлексія**

Назавіце беларускія словы, якія вы ведалі раней і лёгка адгадалі.
Назавіце словы, якія вы змаглі ўспомніць дзякуючы камандзе.
Назавіце словы, якія вы сёння вывучылі.

**Маршрутны ліст (1 – 4 класы)**

Каманда «_________________________________________»

| № | Станцыя | Нумар станцыі | Колькасць балаў | | Подпіс журы |
|---|---|---|---|---|---|
| | | | Атрымана | Максімум | |
| 1 | Назва каманды (па-беларуску, сімвалізуе нешта беларускае) | | | 5 | |
| 2 | Конкурсы<br>«Апрані ляльку. Накармі ляльку» | 1<br>Кабінет рытмікі | | 20 | |
| 3 | Гульня<br>«Збяры валізку» | 2<br>Кабінет № 16 | | 20 | |
| 4 | Конкурс<br>«Смачныя словы. Прыгожыя словы» | 3<br>Кабінет № 15 | | 20 | |
| Усяго | | | | 65 | |